# ПАД АГУЛЬНАЙ СКУРАЮ

Ва ўмовах агульнага дэфіцыту чалавек павінен сьведчыць сваю ляяльнасьць рэжыму ня толькі словамі, але і ўсімі даступнымі жэстамі. Усярэдзіне сябе можна думаць і рабіць што заўгодна, але навідавоку трэба прытрымлівацца дзяржаўнай харэаграфіі і рыторыкі. І жывая чарга — найбольш папулярны з *рытуальных танцаў*, удзельнічаць у якіх быў абавязаны савецкі грамадзянін. Першамайскія дэманстацыі былі сымбалічным паказам усенароднага руху да сьветлае будучыні, але адначасна — чаргой да добразычлівага позірку мясцовага і прыезджага начальства.

Таталітарная ўлада імкнецца скіраваць ўсе рухі цела і душы ў адзін бок, да агульнае мэты. Усе фізыялягічныя праявы жыцьця замоўчваюцца і хаваюцца, усе прасторавыя маніфэстацыі цела максымальна абмяжоўваюцца (праз забарону "непрыстойных" танцаў, інстытут прапіскі, дзяржаўную манаполію на асноўныя ці нават усе сродкі транспарту) дзеля таго, каб атаясаміць чалавека з часам і Гісторыяй.

Каб чалавек быў "упэўнены ў заўтрашнім дні", трэба прымусіць яго штодня паўтараць, як тое робяць стрэлкі гадзіньніка, учорашні дзень. Іосіф Бродзкі ў эсэ "Менш за адзінку" адкрывае нам сапраўднае імя гэтай упэўненасьці: "Формула турмы — недахоп прасторы, кампэнсаваны лішкам часу. Вось што сапраўдыназаляе, вось чаго ты ня можаш адолець. Турма — адсутнасьць альтэрнатываў, і з глузду цябе зводзіць тэлескапічная прадказальнасьць будучыні".

Гэтае адчуваньне безвыходнасьці ўласьцівае, мяркую, толькі таму, хто сядзіць у камэры адзін, без суседзяў (дый ад турэмнага начальства можна чакаць чаго заўгодна). Кожны чалавек, зь якім жывеш побач, — гэта дадатковае акенца ў сьвет, заўсёдная небясьпека, магчымасьць нейкай прыгоды, здольнай раптоўна зьмяніць тваё жыцьцё. Пакуль жывеш разам зь іншымі, хаця б з адным чалавекам, будучыня застаецца непрадказальнай, дый мінуўшчына можа раптам набыць новы выгляд і сэнс.

Апроч таго, паўсюль, дзе чалавек зачынены ў абмежаванай прасторы, — у лякарні, чарзе, вязьніцы, — ён шукае выйсьце ў самім сабе: пачынае размаўляць з сабой, спрачацца і нават рабіць сабе падарункі. Часам здаецца, што ў суседа па купэ ці шпітальнай палаце рысы твару павернутыя вонкі сподам, адваротным бокам: чалавек нібыта абменьваецца жэстамі і думкамі з кімсьці ўсярэдзіне сябе... Немагчыма пазбавіць чалавека свабоды, пакінуўшы яму памяць і ўяўленьне.

Усе правы чалавека — гэта, па сутнасьці, права перайсьці з адной камэры ў іншую і, калі трэба, вярнуцца.

Галоўнае, што засмучае, — гэта недасяжнасьць радасьці шырокага кроку. Найменшы рух трэба ўзгадняць з суседзямі. Зусім незнаёмыя людзі ў чарзе, як і ў камэры, хутка знаходзяць агульную мову — мабыць, таму, што тут няма ні паўнавартаснага "я", ні, паколькі твар суседа бачыш хіба што ў профіль, паўнавартаснага "ты". Наколькі тут цяжка адасобіць аднаго чалавека ад іншага, настолькі ж — дыялёг ад маналёга. (І ці ня ў гэтай "палутарнай" суб’ектыўнасьці — разгадка таго, як нараджаюцца чуткі і анэкдоты, а раней нараджаліся паданьні? Кожнае пакаленьне паўтарае тое, што пачула ад папярэдняга, але ў новай інтэрпрэтацыі.) Гэтае раздваеньне сьвядомасьці —

няпоўнае і таму плённае — ляжыць у падмурку ўсялякай творчасьці. У кожнага аўтара, кожнага творцы ёсьць, прынамсі, адзін безыменны сааўтар.

У Вярхоўны Савет СССР аднойчы прыйшоў ліст ад пэнсіянэра, урывак зь якога потым быў надрукаваны ў “Известиях”: “Я ўсё жыцьцё прастаяў у чэргах, нічога ня маю, і адзінае, што я магу пакінуць маім дзецям і ўнукам, — маю чаргу. Прашу прадугледзець у Законе аб аўтарскім праве магчымасьць перадачы чаргі ў спадчыну”. Сапраўды, каштоўнасьць мае ня толькі дасягнутая мэта, але ўжо сама спроба наблізіцца да яе. Месца ў чарзе — прадаецца! Добра “ідуць” таксама тыя творы мастацтва ці навуковыя працы, дзе, па сутнасьці, няма нічога новага. Каб твае творы паважалі і набывалі, трэба прыладкавацца за кім-небудзь з гучным імём, назвацца руплівым вучнем і захавальнікам вялікай традыцыі...

Чарга — гэта заўсёды ня толькі пануры ланцуг паняволеных абставінамі людзей, але і наша ўласная спроба ўцячы ад свабоды (да якой, паводле Сартра, прыгавораны чалавек), схавацца ад бяссэнсіцы існаваньня за папярэднікаў і пасьлядоўнікаў. Усялякі супольны рух выпраменьвае моцнае поле прыцягненьня: волю да ўлады. Вакол праваднікa электрычнага току заўжды паўстае магнітнае поле. Тое самае і з чаргою — чым больш яна напружаная і дынамічная, тым мацней прыцягвае да сябе ўвагу, зачароўвае і спакушае ўсіх, хто праходзіць побач.

У жывой чарзе часам адчуваеш сябе ўдзельнікам калектыўнага сэксуальнага акту: людзі складаюць велічэзны напружаны пэніс, а крама, у якую яны ўваходзяць, каб неўзабаве выйсьці, падобная да ўтульнай цёплай вагіны. Калі дэфіцытны тавар скончваецца — чарга, затрымаўшыся яшчэ на нейкі час ля пустога прылаўку, ападае і разыходзіцца. А найпрыемней з усіх пачуваецца той, хто пасьпеў “атаварыцца” апошнім.

Але ня кожная эрэкцыя карануецца аргазмам. Да чаго б ні імкнуліся людзі — на ўсіх не стае. “Шмат пакліканых, ды мала абраных”, — папярэджвае Эвангельле. Жыцьцё прываблівае нас сваёй рызыкоўнасьцю: да самага канца невядома, чым усё скончыцца.

Трагедыя сусьветнай гісторыі — у тым, што шчасьця ніколі не хапае на ўсіх. Нельга ўратаваць усіх людзей адразу: так вучыць усялякая рэлігія. Ня кожны, хто кажа: “Госпадзе! Госпадзе!” — увойдзе ў Царства нябёснае. Ня ўсе здолеюць дайсьці да прылаўка і нават проста патрапіць у краму да закрыцьця.

Адзінае, чаго зашмат у грамадзтве татальнага дэфіцыту, дык гэта людзей.

Жыцьцё выбірае сабе рэчышча лёсу гэтаксама, як цела — найбольш зручную альбо эфэктную паставу. Калі доўга стаіш у натоўпе перад дзьвярыма крамы ці дзяржаўнай установы, дзе трэба ўзяць чарговую даведку, — фізычна адчуваеш, як халаднеюць і камянеюць рукі і ногі, застываюць вочы, рысы твару і нават думкі. Паступова ператвараешся ў нешта скульптурна-манумэнтальнае.

Часам здаецца, што побач зь яшчэ жывымі людзьмі ў чэргах стаяць і нават іх узначальваюць помнікі, вітрынныя манэкены, плякаты з моднымі палітыкамі ці сьпевакамі. (Герою ці сэкс-сымбалю неабавязкова быць жывым. Галоўнае, каб пра яго памяталі альбо натхнёна марылі. Мэрылін Манро аднойчы сказала чарговаму жаніху: “Я ўжо даўно ператварылася ва ўласнасьць нацыі. Навошта ты хочаш ажаніцца з помнікам?”)

З чаргі цікава назіраць за дзівакамі, што маюць толькі дзьве нагі і самі кудысьці ідуць. Наколькі чуйнымі робімся мы да суседзяў, настолькі ж глухімі і недасягальнымі — для ўсіх астатніх. Мы чарсьцьвеем як хлеб. Калі нас не бароняць ад вонкавага сьвету глухія каменныя сьцены ці борт карабля — мы самі абрастаем агульнай мэнтальнай скураю, падобнай да мацярынскага чэрава. Пакуль чалавек ведае, дзеля чаго жыве — ён яшчэ не зусім нарадзіўся. Альбо ўжо да нейкай ступені памёр.

Мы зайздросьцім тым, хто бліжэй за нас падышоў да агульнай мэты, і імкнемся не адстаць ні на крок. Амаль не звяртаем увагі на тых, хто ззаду — але забывацца пра іх нельга: абыдуць пры першай магчымасьці. Чалавек у чарзе толькі цяжка ўздыхае, калі бачыць, колькі яшчэ сьпінаў адзьдзяляе яго ад запаветнай мэты, але, зрэдчас абяртаючыся, ён падбадзёрваецца: многіх ён ужо выперадзіў! Усялякі сярэдні чалавек можа, калі азірнецца, усьвядоміць сябе правадыром.

Паступова мы зрастаемся з суседзямі ў адну шматногую істоту з агульнымі сэрцам і галавою. На чужынца, які спрабуе ўлезьці ў нашыя шэрагі, пазіраеш як на нейкую інфэкцыю, як на небясьпечны для нашага агульнага цела мікраарганізм. Заўсёды знаходзяцца нахабнікі, што імчацца да ўлады, да акенца касы ці першай прыгажуні балю без чаргі, па чужых нагах і галовах. Некаторыя абгрунтоўваюць свой прывілей нямогласьцю альбо, наадварот, моцным кулаком. Хвост чаргі пацяшаецца назіраньнем спрэчак, але ў іх ня ўдзельнічае: гэта адбываецца так далёка ад нас! Амаль як у наступным стагодзьдзі. І аднак, чым бліжэй падыходзіш да галавы чаргі, тым больш індывідуальнасьці вяртаецца да цябе. Цалкам пасыўны раней чалавек ля прылаўка перайначваецца: ён ізноў адчувае сябе чымсьці асобным і ўжо нікога не жадае пускаць перад сабою.

Зь іншага боку, чым далей прасунуўся — тым менш увагі зьвяртаеш на тое, што адбываецца ў хвасьце чаргі, хто там яшчэ да нас далучыўся. Ува ўсялякім народзе, палітычным ці мастацкім руху, зразумела, ёсьць выпадковыя людзі, як ува ўсялякім тэксьце — лішнія словы. З кожным крокам абарочваешся ўсё радзей: надта шмат дапытлівых позіркаў ляціць табе ў вочы. Калі нарэшце дажываеш да прылаўка ці да самой сьмерці — з палёгкаю складаеш зь сябе абавязак думаць і прамаўляць ад імя усёй чаргі: ня так і шмат было прыемнага ў гэтым жыцьці, каб памятаць яго ў наступным.

Нам так часта даводзіцца чакаць чаго-небудзь, што паступова мы прызвычайваемся чакаць абы-чаго, якой заўгодна падзеі. У СССР можна было часам убачыць даўжэзную містычную чаргу да амаль пустой крамы: людзі маглі гадзінамі чакаць, што завязуць які-небудзь тавар, нават ня ведаючы наперад, які і на колькі пакупнікоў яго хопіць.

Чарга па нішто сьведчыць, што дзеяслоў “чакаць” можа быць непераходным — гэтаксама, як “жыць” альбо “пісаць” (пра непераходнасьць гэтага апошняга ўжо казаў Ралян Барт). Усялякае дзеяньне, праз якое жыве чалавек, можа мець нейкую мэту, але ці не часьцей яно адбываецца само па сабе, бяз пэўнага намеру і сьвядома абранага накірунку. І менавіта нашая здольнасьць думаць ні пра што і чакаць невядома чаго дапамагае нам, у адрозьненьне ад запраграмаванай на пэўны вынік машыны, адаптавацца да якіх заўгодна перастановак у фізычнай і мэтафізычнай пасьлядоўнасьці навакольных рэчаў.

Нам ня так ужо і шмат патрэбна ў жыцьці. Навошта асобнаму чалавеку мова альбо гісторыя? Мы б даўно разышліся з чаргі куды вочы глядзяць, але кожны стаіць тут ня дзеля сябе аднаго. Чалавек не маліўся б ніводнаму богу, калі б ня мог згадаць у малітве дзяцей, бацькоў — усіх, хто яму дарагі. Нам дапамагае выстаяць тое, што нас чакаюць дома, і чакаюць не з пустымі рукамі. Дачытаць навуковы трактат, дагледзець да канца нудотны фільм нам дапамагае тое, што мы павінны распавесьці пра яго іншым людзям. Мы нібыта крок за крокам скараем нейкую вяршыню, але і вяршыня скарае нас. Вельмі цяжка, калі жывеш ня першы год, махнуць рукой на ўсе свае заваёвы і сысьці, каб дзе-небудзь пачаць жыцьцё зноў, з новым імём альбо целам.

Калі перад самым носам закончылася тое, чаго так доўга чакалі, мы лёгка пагаджаемся набыць хоць што-небудзь, нават зусім не патрэбнае, абы толькі не вяртацца дахаты з пустымі рукамі: трэба ператварыць страчаны час хоць у нешта матэрыяльнае. (Цікава, чым людзі прыдумаюць замяніць сьмерць, калі яе ня хопіць на ўсіх?)

Пераважная колькасьць нашых думак, учынкаў, гадоў праходзіць дарма. І каб з гэтым прымірыцца, трэба так іх і ўспрымаць — як дарунак іншым людзям, у тым ліку нашчадкам: праз тваю памылку хтосьці зь іх хутчэй дасягне сваёй мэты. Аднак зазвычай мы ўспрымаем больш шчасьлівых суседзяў як злодзеяў, што выкрадаюць не скарыстаныя намі магчымасьці й гады…

Мы блытаем чэргі і дасягаем зусім ня той мэты, на якую згадзіліся абмяняць ладны кавалак жыцьця, нашмат часьцей, чым заўважаем гэта. І ўсё ж лепш зрабіць памылку, чым нічога не зрабіць (гэты прынцып, прынамсі, дазволіў эўрапэйскай цывілізацыі падштурхнуць увесь сьвет наперад — невядома, куды і навошта, але хіба можам мы з пэўнасьцю сказаць, дзе і навошта былі да пачатку эўрапэйскай экспансіі?).

Калі выходзіш са шматгадзіннай чаргі на свабоду — адчуваеш сябе немаўлём: глядзіш на сьвет і напачатку нічога ня можаш зразумець. І тое ж самае адчувае чалавек, які выйшаў з абрыдлай, вядомай ва ўсіх падрабязнасьцях турэмнай камэры, вярнуўся з войска ці проста адклаў убок кнігу, якая яго захапіла. Трэба прыдумляць новы ці пакрысе ўзгадваць стары лад жыцьця, складаць з аскепкаў напаўзабытых думак і ўчынкаў новае ці старое “я”. Трэба вучыцца жыць у пазбаўленым звыклых арыенціраў сьвеце, і таму небясьпечна пераходзіць вуліцу: можна трапіць пад машыну.

Кожны ўдала пражыты дзень абуджае ў нас спадзяваньне, што і ўсё жыцьцё можа прайсьці недарма, што яго можна прысвоіць і ўпарадкаваць. Кожнага разу, калі чалавеку стае сілаў выстаяць да канца чаргу, тэрмін арышту ці працоўную зьмену, ён пачынае верыць, што могуць спраўдзіцца ўсе ягоныя задумы і праекты, і нават сама Гісторыя можа дасягнуць сваёй няўцямнай мэты. Ці не таму ледзь заўважна ўсьміхаецца ён, выходзячы з заводзкай прахадной, сьледчага ізалятару, а ўрэшце і чарговага цела?